С. У. КАБЯК

# У. І. ЛЕНІН І РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Ленінізм, імя Леніна былі рэвалюцыйным сцягам у барацьбе працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР. Пасля таго, як заходнія вобласці Беларусі па Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 года адышлі ад Савецкай Беларусі да буржуазна-памешчыцкай Польшчы, асноўную ролю ў прапагандзе ленінскіх ідэй там пачала адыгрываць Камуністычная партыя Польшчы (КПП), а затым і Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), створаная ў канцы 1923 года.

У спецыяльнай пастанове III з'езда КПП (студзень — люты 1925 года) гаварылася: «Мы маем намер ісці да канца шляхам, які ўказаў нам Ленін, ісці да рэвалюцыйнай барацьбы з лозунгамі ленінізму, як нязгаснай зброяй, якая забяспечыць пралетарыяту канчатковую перамогу»[1].

На неабходнасць выхавання працоўных у духу ленінскіх ідэй указвалі рашэнні III канферэнцыі КПЗБ (студзень 1926 года), I з'езда КПЗБ (чэрвень — ліпень 1928 года), II з'езда КПЗБ (май 1935 года) і іншыя партыйныя дакументы. Асноўнымі шляхамі азнаямлення працоўных Заходняй Беларусі з ленінскай ідэйна-тэарэтычнай спадчынай былі: выданне невялікіх прац У. І. Леніна ў выглядзе брашур; публікацыя яго артыкулаў на старонках падпольных камуністычных газет; шырокае выкарыстанне вытрымак і цытат з твораў У. І. Леніна ў тэарэтычных матэрыялах газет; пераказ зместу асобных работ У. І. Леніна ў сувязі з гадавінамі іх выхаду ў свет ці разгляданнем якой-небудзь праблемы.

Творы У. І. Леніна ў буржуазна-памешчыцкай Польшчы выдаваліся як легальна, так і нелегальна. Першай легальна выйшла ў Варшаве ў 1919 годзе ў прыватным выдавецтве Ф. Чэсіка праца «Дзяржава і рэвалюцыя». Аднак у 1919—1939 гадах у Польшчы і Заходняй Беларусі легальнае выданне прац У. І. Леніна было цяжкай справай. Знойдзеныя пры арышце кнігі У. І. Леніна, нават калі яны былі выдадзены легальна, нярэдка фігуравалі як істотны доказ «злачыннай» дзейнасці абвінавачваемага.

У Заходняй Беларусі магчымасці для публікацыі прац У. І. Леніна былі яшчэ больш абмежаванымі, чым у Польшчы. Падпольныя друкарні ў Вільна, Гродна, Брэсце і Беластоку дзейнічалі ў надзвычай складаных умовах канспірацыі і не былі прыстасаваны да выдання вялікіх прац. Там галоўным чынам друкаваліся лістоўкі, камуністычныя газеты і часопісы. Асабліва значэнне мела публікацыя шэрагу артыкулаў і прамоў У. І. Леніна ў зборніку «Аб узброеным паўстанні» (на рускай мове). У яго, акрамя рэдакцыйнага артыкула, увайшлі працы У. І. Леніна «Марксізм і паўстанне», «Парады чалавека з боку» і інш.

У 1932 годзе ў Вільна падпольна на беларускай мове была выдадзена праца У. І. Леніна «Партызанская вайна». Заходнебеларускія камуністы не выпадкова звярнуліся да працы, у якой асвятляліся разнастайныя формы і метады барацьбы супраць капіталістаў і памешчыкаў.

З выпадку дзевятай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі орган заходнебеларускіх камуністаў часопіс «Бальшавік» змясціў у некалькі скарочаным выглядзе прамову У. І. Леніна, з якой ён выступаў у 1921 годзе ў сувязі з чацвертай гадавінай Кастрычніка. Уладзімір Ільіч адзначыў, што «першая перамога — яшчэ не канчатковая перамога... Сутнасць заключаецца ў тым, што лёд зламаны, што шлях адкрыты, дарога вызначана»[2].

У лютым 1926 года «Чырвоны сцяг», орган ЦК КПЗБ, апублікаваў вялікі артыкул на тэму «Ленін і сялянства». У ім гаварылася, што У. І. Ленін заўсёды вёў барацьбу не толькі за інтарэсы рабочага класа, але і за інтарэсы працоўнага сялянства. Аўтар артыкула робіць спасылкі на адпаведныя працы У. І. Леніна [3].

Спецыяльныя артыкулы, прысвечаныя розным бакам дзейнасці У. І. Леніна, друкаваліся, як правіла, у сувязі са знамянальнымі падзеямі і палітычнымі кампаніямі. Загалоўкі артыкулаў у газетах і часопісах, а таксама ў лістоўках, прысвечаных У. І. Леніну, адлюстроўваюць іх палітычную накіраванасць: «Толькі пад сцягам Леніна, пад сцягам Камуністычнай партыі можна дасягнуць перамогі над дыктатурай буржуазіі», «Аб ленінскім выхаванні партыі», «За справу Леніна», «За ленінізм, супраць трацкізму!», «Пад сцягам ленінскага Камінтэрна» і г. д.

Інтарэс да вывучэння марксізму-ленінізму праяўлялі ўсе нізавыя пар-

тыйныя арганізацыі Заходняй Беларусі. Камуністычная літаратура карысталася вялікім поспехам сярод працоўных горада і вёскі. Ілаўскі падпольны райком КПЗБ Кобрынскага павета стварыў у 1927 годзе хатучытальню, у якой нелегальна захоўваліся творы класікаў марксізму-ленінізму.

Пэўная работа па вывучэнню твораў У. І. Леніна праводзілася і ў турмах. КПЗБ клапацілася пра тое, каб палітзняволеныя выкарыстоўвалі ўсе самыя малыя магчымасці ў цяжкіх умовах турэмнага рэжыму для павышэння сваіх ідэйна-тэарэтычных ведаў. У ліпені 1928 года палітзняволены Гродзенскай турмы Сямён Дубовік у пісьме брату пісаў: «Дасылаю табе спіс кніг, якія па меры магчымасці прашу выслаць... Нічога не трэба. Давайце кнігі»[4]. У спісе было пералічана 30 назваў, сярод іх творы У. І. Леніна. У турмы кнігі дастаўляліся рознымі шляхамі.

Зразумела, што яшчэ цяжэй было іх захаваць. «Памятаю, у 1933 годзе ў камеры турмы,— успамінаў С. О. Прытыцкі,— знаходзілася добра схаваная кніга У. І. Леніна «Што рабіць?» Вокладка кнігі і некалькі першых раздзелаў былі з іншага твора, а далей ішоў тэкст з «Што рабіць?» Ленінскі твор мы чыталі і перачытвалі»[5]. Дакументы архіваў таксама пацвярджаюць тое, як камуністы і камсамольцы, прагрэсіўная інтэлігенцыя Заходняй Беларусі, нягледзячы па тэрор з боку дэфензівы, настойліва вывучалі творы У. І. Леніна.

Кампартыя Заходняй Беларусі ўдзяляла вялікую ўвагу тэарэтычнай падрыхтоўцы кіруючых кадраў. Падрыхтоўка прапагандыстаў, якія распаўсюджвалі ідэі ленінізму сярод насельніцтва Заходняй Беларусі, ажыццяўлялася ў Гродне, Вільна, Беластоку. Там былі створаны кароткатэрміновыя партыйныя школы, дзе партыйны актыў вывучаў не толькі тэарэтычную літаратуру, але і творы У. І. Леніна. Асабліва важнае месца ленінская тэматыка займала ў школе КПЗБ, адкрытай на тэрыторыі Савецкай Беларусі пры садзеянні прадстаўніцтва Кампартыі Польшчы пры Выканкоме Камінтэрна.

Вялікі ўплыў на ўспрыняцце заходнебеларускімі працоўнымі ідэй сацыялізму аказвала вывучэнне біяграфіі правадыра сусветнага пралетарыяту. Асноўным метадам яе вывучэння была самастойная работа камуністаў і камсамольцаў. Практыкаваліся выступленні лектараў з дакладамі і гутаркамі пра жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць Уладзіміра Ільіча.

У Заходняй Беларусі, пачынаючы з 1925 года, з 14 па 22 студзеня праводзіліся дні «Трох Л» — У. І. Леніна, К. Лібкнехта і Р. Люксембург. Дні «Трох Л» нібы сімвалізавалі інтэрнацыянальнае адзінства міжнароднага пралетарыяту. У гэты перыяд камуністычныя арганізацыі выпускалі лістоўкі, газеты з партрэтамі У. І. Леніна, К. Лібкнехта і Р. Люксембург, расказвалі ў артыкулах пра жыццё і дзейнасць правадыроў міжнароднага пралетарыяту. На многіх прадпрыемствах праводзіліся мітынгі і масоўкі рабочых. Як правіла, такія мітынгі заканчваліся выкананнем «Інтэрнацыяналу» ці песняй «Вы жертвою пали в борьбе роковой».

У сувязі з падрыхтоўкай да другой гадавіны з дня смерці У. І. Леніна ЦК КПЗБ выдаў інструкцыйны ліст да ўсіх акруговых камітэтаў партыі аб узмацненні агітацыйнай работы і арганізацыі выступленняў рабочых. «Распаўсюджвайце пракламацыі, прысвечаныя памяці нашых правадыроў,— гаварылася ў лісце,— арганізоўвайце масоўкі, выступайце па гэтым пытанні на мітынгах і рабочых сходах з антыімперыялістычнымі лозунгамі. Каардынуйце свае выступленні з камсамолам»[6].

І камсамол не заставаўся ў баку ад гэтай важнай палітычнай кампаніі. У студзені 1926 года ЦК КСМЗБ выдаў лістоўку, прысвечаную дням «Трох Л». «Мільёны рабочых і сялян,— гаварылася ў лістоўцы,— у гэты дзень даюць клятву на вернасць ідэалам Леніна. Імя Леніна будзе сцягам, вакол якога мільёны рабочых і сялян аб'ядноюцца для барацьбы з буржуазным мілітарызмам»[7].

Пра напрамак агітацыі КПЗБ сярод працоўных у гэтыя дні можна меркаваць па зместу тых лозунгаў, якія былі напісаны на транспарантах і сцягах. Так, у данясенні каменданта паліцыі Нясвіжскага павета 24 студзеня 1926 года павятоваму старасту паведамлялася, што паліцэйскі кантроль знайшоў у вёсках Жуковіцкай гміны чырвоныя сцягі з надпісам на рускай мове: «У гонар памяці Леніна, Лібкнехта, Люксембург! Няхай жыве аб'ядная Беларусь»! Непадалёку Вялікай Бераставіцы Гродзенскага павета былі вывешаны тры пунсовыя палотны з лозунгамі на рускай, беларускай і польскай мовах: «Памёр Ленін, але справы яго жывуць. Патрабуем вызвалення палітычных зняволеных! Далоў буржуазны мілітарызм!»[8]

Штогод у студзеньскія дні ў перыядычным друку КПЗБ змяшчаліся артыкулы, прысвечаныя У. І. Леніну. Напрыклад, тэарэтычны орган КПЗБ «Бальшавік» у першым нумары 1927 года пісаў: «Тры гады назад абарвалася жыццё вялікага рэвалюцыянера ўсіх часоў, народаў і класаў — Уладзіміра Ільіча Леніна. Гэта быў чалавек, які заснаваў Камуністычны Інтэрнацыянал, які стварыў бальшавіцкую партыю, які прывёў сусветную гісторыю да Вялікага Кастрычніка... Леніна няма, але ленінізм жыве, усё шырэй і глыбей пранікае ў самую гушчыню працоўных»[9]. ЦК КПЗБ, а таксама акруговыя камітэты партыі штогод распаўсюджвалі матэрыялы да даклада пра жыццё і дзейнасць Уладзіміра Ільіча, заклікалі да шырокага ўдзелу ў гэтыя дні ў мітынгах і дэманстрацыях. Так, у 1930 годзе ў час кампаніі «Трох Л» у Вільна адбылося 16 масовак, у Брэсце — 10, у Пінску — 7, у Беластоку — дэманстрацыя. У Пружанскім павеце ў 60 вёсках распаўсюджвалася літаратура, у 25 былі вывешаны рэвалюцыйныя плакаты і транспаранты і праведзены 4 масоўкі[10]. У 1926 годзе Пінскі АК КПЗБ выпусціў лістоўку, у якой, у прыватнасці, гаварылася: «21 студзеня мінула шэсць гадоў з дня смерці вялікага правадыра. Узмацнім жа барацьбу пад кіраўніцтвам КПЗБ па ленінскаму шляху... Працоўныя Пінскай акругі, ушаноўвайце памяць свайго правадыра»[11].

Асабліва вялікая работа праводзілася ў ленінскія дні сярод моладзі. Штогод студзеньскія нумары газеты «Малады камуніст» прысвячаліся У. І. Леніну, К. Лібкнехту і Р. Люксембург. «Жыццё гэтых рэвалюцыянераў,— пісала газета ў студзені 1928 года,— іх барацьба павінны стаць вялікім прыкладам таго, якім павінен быць кожны рэвалюцыянер, яны павінны стаць ідэалам, да якога імкнецца кожны юны пралетарый»[12]. У час тыдня «Трох Л» 1933 года Віленскі акруговы камітэт КСМЗБ распаўсюдзіў лістоўку наступнага зместу: «Маладыя рабочыя Вільна! У гадавіну смерці Леніна, Лібкнехта, Люксембург 15—21 студзеня арганізоўвайце масоўкі і сходы. Да ўзмоцненай барацьбы за хлеб і працу, за дапамогу для беспрацоўнай моладзі!.. Супраць надзвычайных судоў і турэмнага статуса!»[13] Звыш тысячы юнакоў і дзяўчат Вільна адгукнуліся на гэты заклік і выйшлі на дэманстрацыі. Рабоча-сялянская моладзь у студзеньскія дні арганізавала шматлікія масоўкі, сходы і дэманстрацыі ва ўсіх кутках Заходняй Беларусі. Напрыклад, у справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення адзначалася, што 21 студзеня ў Камянец-Літоўскім раёне праведзены масоўкі, прысвечаныя гадавіне смерці У. І. Леніна. У Гарадзішчы Баранавіцкага павета адбыўся сход, на якім прысутнічалі камсамольцы. У Слоніме быў вывешаны сцяг з лозунгамі: «Няхай жыве ленінізм! Не — фашысцкай дыктатуры Пілсудскага! Усе на абарону СССР! Няхай жыве КПЗБ і КПП». Такія ж масоўкі адбыліся ў Гродне, Брэсце, Беластоку і Вільне[14].

Дні памяці У. І. Леніна праводзіліся на тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі на працягу ўсіх гадоў існавання КПП, КПЗБ і КСМЗБ, г. зн. да 1938 года. У ленінізме працоўныя Заходняй Беларусі бачылі верны компас барацьбы за свабоду, незалежнасць і дэмакратычны шлях развіцця. Гэтая барацьба прынесла плён. Прыйшлі вераснёўскія дні 1939 года, калі з дапамогай вялікага савецкага народа працоўныя Заходняй Беларусі набылі доўгачаканую свабоду, уз'ядналіся са сваімі адзінакроўнымі братамі ў Савецкай Беларусі, уліліся ў адзіную сям'ю народаў СССР.

1 Пастановы III з'езда Камуністычнай партыі Польшчы. Вільня, 1925. С. 83.
2 Бальшавік. 1926. № 7—8.
3 Гл.: Чырвоны сцяг. 1926. № 1 (43).
4 ЦПА ИМЛ при ЦК КПСС. Ф. 539, оп. 3, д. 933, л. 63.
5 Жизнь, отданная народу. Минск, 1978. С. 35.
6 Рукапісны аддзел Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Ф. 15015.
7 ДА Гродзенскай вобласці. Ф. 17. воп. 1, спр. 142, арк. 80.
8 Там жа. Ф. 55, воп. 1, спр. 142, арк. 118.
9 Бальшавік. 1927. № 1.
10 ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 47, арк. 79; спр. 271, арк. 307.
11 ДА Брэсцкай вобласці. Ф. 2042, воп. 1, спр. 7752, арк. 2.
12 Малады камуніст. 1928. № 1—2.
13 ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 415, арк. 224.
14 ДА Брэсцкай вобласці. Ф. 1, воп. 9, спр. 966, арк. 58; ЦГАОР СССР. Ф. 4459, оп. 2, д. 174, л. 187.